# У аснове Камунікатыўнай культуры – дакладнасць маўлення

**Т. К. Пільчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі № 1 г. Ліда

*Усё мілагучна для слыху майго:*
*І звонкае “дзе” і густое “чаго”.*
Пімен Панчанка

Развіццё моўна-камунікатыўнай культуры будзе паспяховым, калі ісці па шляху засваення, успрымання яе ў формах камунікатыўна-культурных дасягненняў беларускага народа.

На падставе мэтавых ўстановак моўнай адукацыі можна сфармуляваць некаторыя задачы:

- ✓ азнаямленне з сістэмай беларускай мовы, якую ўтвараюць фанетычны, лексічны і граматычны ўзроўні, і фарміраванне на кожным з іх вуснай і пісьмовай літаратурнай мовы школьнікаў;
- ✓ засваенне мовы як сродку навучання, атрымання ведаў, фарміравання асобы;
- ✓ устанаўленне заканамерных сувязей паміж характарам моўнай дзейнасці і вынікам засваення мовы;
- ✓ авалоданне ўменнямі ўжываць сродкі выразнасці беларускай мовы ў адпаведнасці з мэтай выказвання, камунікатыўнай мэтазгоднасцю, умовамі зносін;
- ✓ выяўленне суадносін паміж структурнымі элементамі мовы – тэкстам, сказам, словам, гукам;
- ✓ фарміраванне любві да роднай мовы, моўна-камунікатыўнай культуры школьнікаў на аснове іх агульнай культуры ў працэсе абмену выказваннямі, пры перадачы некаторага лагічнага зместу, выказванні волевыяўлення, пачуццяў, эмоцый.

Змест сістэмы развіцця маўлення вучняў прадстаўлены ў трох кірунках. Гэта фарміраванне:

- ✓ правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні;
- ✓ уменняў вуснага маўлення;
- ✓ уменняў пісьмовага маўлення.

Змест навучання па кожным кірунку размяркоўваецца з паступовым ускладненнем у кожным наступным класе, развіццё адбываецца праз павелічэнне самастойнасці вучняў у ажыццяўленні асобных відаў вучэбнай работы.

- ✓ Гутарка па змесце пачутага ці прачытанага тэксту, практыкавння з мэтай дасягнення ўласнага разумення.
- ✓ Вылучэнне і ўстанаўленне значэнняў незнаёмых слоў і выразаў праз кантэкст, пераклад ці з дапамогай тлумачальнага слоўніка.
- ✓ Вылучэнне і асэнсаванне лінгвакраязнаўчай інфармацыі.

Фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні забяспечваецца сістэматычнай працай над тэкстамі, у працэсе якой вучні павінны не толькі дасягнуць разумення ўспрынятага, але авалодаць спецыяльнымі спосабамі дзейнасці, якія забяспечваюць гэтае разуменне.

Змест працы па фарміраванні ўменняў вуснага маўлення

- ✓ Пераказ тэксту па пытаннях і апорных словах.
- ✓ Калектыўная пабудова вуснага выказвання па апорных словах.
- ✓ Падзел тэксту на часткі, прыдумванне загалоўка да іх.
- ✓ Падрабязны пераказ тэксту паводле плана.
- ✓ Пабудова пад кіраўніцтвам настаўніка выказвання па малюнках, апорных словах, планах, прапанаваных настаўнікам.
- ✓ Падрабязны пераказ тэксту паводле самастойна складзенага плана. Самастойная пабудова выказвання на прапанаваную тэму паводле калектыўна складзенага плана.

Работа па фарміраванні ўменняў вуснага маўлення адбываецца ва ўзаемасувязі з фарміраваннем умення асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы. Пасляховасць авалодання ўменнем пераказваць тэкст залежыць ад сістэматычнай, планамернай працы ў гэтым кірунку. Вызначальную ролю пры правядзенні такой работы мае ступень падтрымкі вучня пры ажыццяўленні пераказу. У 5 класе вусны пераказ ажыццяўляецца па пытаннях настаўніка і апорных словах. У 6 класе практыкаванні для навучання пераказу прадугледжваюць калектыўную працу па стварэнні плану тэксту, авалоданне ўменнем дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі і складаць яго план павінна дасягнуць узроўню самастойнага дзеяння вучняў. Яшчэ адным аспектам з'яўляецца стварэнне ўласнага тэксту без узору. Гэты від працы з'яўляецца найбольш складаным і важным, неабходна выкарыстоўваць серыі малюнкаў ці сюжэтны малюнак, план, апорныя словы, слоўнік.

Змест працы па фарміраванні ўменняў пісьмовага маўлення

- ✓ Пісьмовы адказ на пытанні з дапамогай апорных слоў.
- ✓ Запіс пад дыктоўку слоў, сказаў, тэкстаў.
- ✓ Пісьмовы пераказ тэксту паводле калектыўна складзенага плана і па апорных словах.
- ✓ Напісанне сачынення на прапанаваную тэму паводле калектыўна складзенага плана і па апорных словах.

Фарміраванне ўменняў пісьмовага маўлення ў працэсе навучання школьнікаў беларускай мове вылучана на ўзроўні элементарных уменняў, якія знаходзяцца на стадыі паступовага фарміравання. У сувязі з гэтым усе віды работ ніколі не выконваюцца вучнямі самастойна, а толькі з дапамогай ці пад кіраўніцтвам настаўніка пры наяўнасці пэўных апор.

У рабоце над узбагачэннем і актывізацыяй слоўніка вучняў фарміруецца ўменне бачыць, з дапамогай якіх слоў і як праяўляецца дзеючая асоба, учынак, з'ява, а пазней і ўменне тлумачыць, чаму выбраны менавіта гэтыя словы для характарыстыкі прадметаў, пра што яны гавораць. Праз аналіз мовы твораў дзеці знаёмяцца з сінонімамі, пашыраецца разуменне вучнямі значэння слоў і спосабаў іх выкарыстання. У дзяцей для гэтага ёсць слоўнік настрою, словы для характарыстыкі галоўных герояў, тэматычная лексіка.

Зместам слоўнікавай працы з'яўляецца:

- ✓ фарміраванне ўвагі да слоў, якія ўжыты ў тэксце, умення выяўляць розныя адценні значэнняў слоў у кантэксце і правільна іх выкарыстоўваць у мове, ужываць словы ў прамым і пераносным значэнні;
- ✓ знаёмства з мнагазначнасцю слова, а таксама з яго эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай. Практычна перад вучнямі раскрываецца багацце беларускай мовы, выразнасць і паэтычнасць слова.

Для засваення лексічнага значэння слоў прапануюцца такія заданні:

- ✓ Знайсці слова на беларускай мове.
- ✓ Суаднесці словы і іх значэнні.
- ✓ Дапоўніць сказ словам.
- ✓ Выбраць патрэбнае слова.
- ✓ Скласці сказ з дадзеных слоў.
- ✓ Развіць сказ. Гульня "Снежны ком".

Асаблівая ўвага звяртаецца на работу са слоўнікавымі словамі:

- ✓ падабраць адпаведныя слоўнікавыя словы (малая, вялікая, трохпакаевая…; спелы, чырвоны, смачны…);
- ✓ падабраць да іх роднасныя словы;
- ✓ - паставіць словы ў множны лік;
- ✓ змяніць словы так, каб яны набылі памяншальна-ласкальнае значэнне.

Вялікую дапамогу ў вырашэнні гэтай мэты могуць аказаць практыкаванні, зарыентаваныя на навучанне вусным і пісьмовым пераказам на аснове звязных тэкстаў.

***Прыём*** арганізацыі сацыяльна-ролевай гульні ***на аснове папярэдніх тэкстаў*** дае магчымасць звярнуцца да тэкстаў, якія адлюстроўваюць жыццёвую мудрасць беларусаў. Прэцэдэнтныя тэксты сведчаць пра маўленчую культуру чалавека, багацце яго слоўнікавага запасу. Да такіх тэкстаў належаць:

- ✓ цытаты з твораў беларускіх класікаў;

✓ выслоўі: афарызмы, прыказкі, якія ўтрымліваюць жыццёва значную думку, перадаюць яе коратка, трапна;

✓ творы вуснай народнай творчасці: жарты, народныя анекдоты, загадкі.

Звяртаючыся да папярэдніх тэкстаў, настаўнік павінен раскрыць іх пазнавальнае і эмацыянальнае значэнне, прадэманстраваць нацыянальную спецыфіку беларускай мовы і літаратуры. Пры арганізацыі сацыяльна-ролевай гульні такія тэксты – апорны элемент у апісанні сітуацыі. Карысным будзе і завучванне тэкстаў на памяць.

Вучням прапануюцца выказванні вядомых людзей. Навучэнцы павінны размеркаваць выказванні тэматычна, вызначыць аўтара,запісаць разуменне іх сэнсу ў межах 5–7 сказаў. У якасці заключнага этапу такой работы я прапаноўваю скласці тэкст, абапіраючыся на пэўную тэму. У форме невялікага тэксту ці публіцыстычнага эцюда вучням прапануецца аргументавана асвятліць пэўнае выказванне падабраць 10 тэматычных сказаў з твораў беларускай літаратуры Дадзены прыём дазваляе фарміраваць удумлівых вучняў, бо пісьмовы каментарый садзейнічае фарміраванню уменняў інтэрпрэтаваць інфармацыю, прапускаць яе праз асабісты вопыт, будаваць асацыяцыі.

Ролевае пераўвасабленне дазволіць рэалізаваць сваю індывідуальнасць, творчыя здольнасці, развіваць камунікатыўны патэнцыял.

У якасці прыкладаў можна прывесці фрагменты вывучэння розных раздзелаў і тэм школьнага курса беларускай мовы з уключэннем сацыяльна-ролевых гульняў, распрацаваных на аснове вышэйпералічаных прыёмаў.

Напрыклад, ***пры вывучэнні тэмы “Вымаўленне і правапіс галосных о, э, а; е, ё, я” (5 клас)*** сацыяльна-ролевая гульня паспрыяе ўдасканаленню ўменняў планаваць маўленчую дзейнасць, адчуваць суразмоўцу і разумець сітуацыю, кантраляваць развіццё камунікацыі. Настаўнік прапануе прачытаць верш і адказаць на пытанне: “Пра што размаўлялі вароны, якія тэмы іх цікавілі?”

*Купілі дзве вароны*
*Мабільныя тэлефоны.*
*Размаўляюць дзень пры дні*
*На зямлі і ў вышыні:*
*Пра сяброўак і каханне,*
*Пра вячэру і сняданне,*
*Пра сакрэты сваіх мар.*
*Кар-кар-кар ды кар-кар-кар.*
*Болей двух гадоў, дарэчы,*
*Не было ў іх сустрэчы.*
*Неяк раз адна з варон*
*Свой згубіла тэлефон.*
– *Як сяброўка там жыве?*
*Я злятаю да яе…*
*Было весела крылатым,*
*Іх сустрэча стала святам.*

*(Н. Галіноўская. Вароны і тэлефоны)*

Пасля чытання тэксту прапануецца заданне: “*Уявіце*, што вы сустрэлі свайго сябра, якога даўно не бачылі. *Як вы будзеце* вітаць яго? *Пра што* запытаеце? *Якія тэмы* ў час размовы будуць агульнымі і цікавымі для вас? *Разыграйце такі дыялог* з суседам па парце. Чаму ў размове шмат кароткіх сказаў? Як вам дапамагаюць жэсты, міміка, паўзы?”

***Прыём пабудовы кампазіцыйнага выказвання “Жывое слова”*** пры вывучэнні тэмы ***“Назоўнік” (6 клас)*** дазваляе актуалізаваць лексіка-граматычныя ўменні вучняў. Удасканаліць маўленчыя ўменні, такія як разуменне асноўнай думкі, пошук і перадача патрэбнай інфармацыі, а таксама развіваць уласна камунікатыўныя ўменні: планаванне маўленчай дзейнасці, арыентацыя ва ўмовах камунікацыі.

Настаўнік прапануе вучням паслухаць тэкст і запомніць народныя прыметы:

*Шмат якія звяры і птушкі ўмеюць прадказваць надвор’е. Вось кацяня кіпці аб сцяну вострыць – значыць, хутка будзе дождж. Мордачку хавае, лапамі яе захінае – марозныя дні надыходзяць. А раскінецца прывольна, лапкамі ўгору – цёплае і сухое надвор’е будзе. Гусак хавае нос пад крыло – пахаладае. Вераб’і ў пыле купаюцца – хутка дожджык пойдзе.*

*Але не толькі дождж і вецер, сцюжу і цяпло прадказваюць птушкі і звяры. Яны адчуваюць загадзя, што набліжаецца грозная падземная бура. Дзесьці ўдалечыні ледзь-ледзь уздрыгнула зямля, данёсся з-пад яе амаль нячутны гул. Чалавек не звярнуў увагі. А сабакі, змеі, яшчаркі, рыбы занепакоіліся: бяда будзе! (Паводле Б. Зубкова)*

Далей вучням падаецца апісанне ***гульнёвай сітуацыі***: “*Уявіце* сабе, што вам прапанавалі ***стаць вядучым перадачы “Тэлебарометр”.*** Падрыхтуйце выступленне для рубрыкі “Народныя прыметы”, выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту”.

Тэксты да ўрокаў стараюся падбіраць такія, каб яны былі цікавыя з пункту погляду арфаграфіі, утрымлівалі розныя сінтаксічныя канструкцыі. Правільна падабраны тэкст можа даваць веды вучням, садзейнічае актывізацыі іх творчых здольнасцей.

Якія ж заданні будуць карыснымі для вучняў для замацавання тэмы і адначасова для падрыхтоўкі да алімпіяды, да здачы экзамена?

***Прыём “Збяры тэкст”.*** Навучэнцам прапануецца скласці тэкст па пэўных падказках, першапачаткова выконваем такое заданне ўсім класам. Потым матываваным вучням прапаную выканаць заданне самастойна, астатнія працуюць у групах. Пасля прапаную эталон. Заданні да тэксту падбіраю ў адпаведнасці з тэмай і мэтамі ўрока. Пры неабходнасці ўключаю заданні на паўтарэнне, замацаванне вывучанага матэрыялу. Ужываю заданні рознай ступені цяжкасці, прытрымліваюся прынцыпу рознаўзроневасці.

Не трэба пакідаць па-за ўвагай філалагічна адораных вучняў, таму на кожным уроку неабходна не толькі сістэматызацыя ведаў па тэме, але і актыўная праца з тэкстам. Апора на тэкст дае магчымасць вырашаць задачы,

накіраваныя на засваенне норм літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачэнне слоўніка навучэнцаў. *Узор задання.* Скласці тэксты па ключавых словах, падабраць эпіграфы да тэкстаў, тэксты да эпіграфаў.

Прыём *разгортвання тэматычнага сказа, абзаца тэксту.* Тэматычны сказ абзаца – сказ, які акрэслівае межы тэмы; утрымлівае, як правіла, слова, словазлучэнне ці частку сказа, якія патрабуюць развіцця, дэталізацыі. У тэксце выбіраецца адзін з названых элементаў. Вучні атрымліваюць заданне пашырыць тэматычны сказ абзаца, папоўніць яго прыкладамі, падабраўшы патрэбную інфармацыю, разгарнуць думку, абапіраючыся на ўласны вопыт, прывесцісваепрыклады.

Потым да абзаца дадаецца вучнёўскі тэкст. І калі першая частка задання выконваецца пісьмова, то працяг тэксту вучні складаюць вусна без падрыхтоўкі.

**Прыклады працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы на III ступені навучання.**

(І) Ц…кава наз…валі ў старажытнас..ці сакавік ____ бярозазол. (2) Людзі ў гэты месяц паві…ы былі спаліць б…разнякі ачы…ціць з…млю пад новы ўра…ай, поп…лам з бяроз угноіць глебу. (3) Па…рыхтаваць гоні___ ______ каб яны змаглі прыняць зерне ___і потым узгадаваць хлебны колас. (4) (Адна)часова абуджаліся сокі. (5) Клёны плакалі кл…новікам а бярозы — смачным б…розавікам. (6) Адагрэтыя слёзы дрэў пачыналі вясну. (7) А крыху паз… ней на галінках з…яўляліся першы… клейкія лісточкі. (8) Адзін такі лісточ…к зляцеў з галінкі ___і трапіў на гер… Бярозы, побач з датаю — 1477год. (9) Значыць __Бярозе ўжо больш за 530 гадоў.

(10) [1]Сё…яшняе [2]дзіўнае паселішча_______ агінала н…калі [3]балотная даліна прарэза..ая ракой [4]Ясельдай, якая (так)сама змешчана на гербе, пазначана( ў)нізе [5]тонен…кім___ сінім па….ском.

(11) Разгадаць назву горада зусім (не )цяжка: імя паселішча атрымала дзякуючы дрэву. (12) Складаней зразумець ____ чаму ў былога горада і сучаснай ч..гуначнай станцыі імя Бяроза-Картузская. (13) Справа ў тым, што некалі тут пасяліліся манахі___ і звалі іх картузамі. (14) Мелі тыя манахі асобныя домікі — келлі, дзе маліліся, перапісвалі кнігі і ноты, а яшчэ былі яны выдатнымі жывапісцамі і раз…бярамі. (15) Жылі (манахі)картузы ў многіх гарадах …ўропы, на тэрыторыі Беларусі — толькі ў Бярозе. (16) Так Бяроза і стала Карту…скай.

***Заданні***

***Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку.***

***Дайце тэксту загаловак, які б адлюстроўваў тэму .***

***Выпішыце з 11 сказа словазлучэнні, вызначце від сінтаксічнай сувязі ў гэтых словазлучэннях.***

***Знайдзіце ў тэксце адпаведнік рус. словазл.”берёзовый сок”.***

**Праца з тэкстам на аснове папярэдняй інфармацыі.**

1. 1506 год – скончыў … ўніверсітэт, атрымаў званне …
2. У 1512 годзе прысудзілі званне …

3. У 1517–1519 гг. у Празе выдаў … … ў перакладах на …

4. У прадмове да кнігі “Псалтыр” Скарына пісаў, што асноўнўая задача яго кніг – гэта …

5. У Вільні ў… годзе Скарына выдае “…” У гэтым выданні Скарына ўпершыню зашыфраваў сваё аўтарства ў выглядзе …

6. Апошнюю з вядомых нам кніг Скарына выдаў …, і гэта была …

7. Наватарства Скарыны заключалася ў тым, што ён …

8. Усяго Скарына аўтар … арыгінальных прадмоў і … пасляслоўяў да выдадзеных ім асобных кніг Бібліі.